У Савет па абароне
дысертацыі Д 01.42.01 пры
ДНУ «Цэнтр даследаванняў
беларускай культуры, мовы і
літаратуры Нацыянальнай
акадэміі навук Беларусі»
вул. Сурганава, 1, корп. 2,
220072, г. Мінск

# ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА

на дысертацыю Селях Аксаны Аляксандраўны
**«Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20 – 80-я гг. ХХ ст.»**,
прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – «этнаграфія, этналогія і антрапалогія»

**1. Адпаведнасць зместу дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны**

Змест дысертацыі А.А. Селях «Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20 – 80-я гг. ХХ ст.», навуковыя вынікі, атрыманыя аўтарам, поўнасцю адпавядаюць спецыяльнасці 07.00.07 – «этнаграфія, этналогія і антрапалогія» (гістарычныя навукі). Пастаўленыя даследчыцай задачы, а таксама сродкі іх вырашэння знаходзяцца ў сферы гістарычных навук і абапіраюцца на дасягненні айчыннай і замежнай этналогіі. Пашырэнне метадалагічнай базы шляхам выкарыстання інструментарыя гендарных даследаванняў, гісторыі штодзённасці, культурнай антрапалогіі, вуснай гісторыі дазволілі аўтару правесці комплекснае даследаванне трансфармацыі паўсядзённасці беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20 – 80-я гг. ХХ ст.

**2. Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Актуальнасць тэмы дысертацыі Аксаны Аляксандраўны Селях абумоўлена тым, што ў сучасным грамадстве разам з развіццём сістэмы камунікацыйных працэсаў і тэхналогій павялічваюцца тэмпы трансфармацыі ўсіх сфер жыццядзейнасці чалавека. Даследаванне трансфармацыі

паўсядзённага жыцця беларускіх заходнепалескіх сельскіх дзяўчат, дыскурс якога змяняўся на працягу 20–80-х гг. XX ст. пад уплывам працэсаў мадэрнізацыі, якія суправаджаліся паступовым страчваннем актуальнасці традыцыйных элементаў сацыяльнага жыцця і адначасова пашырэннем гарызонтаў і магчымасцей асобы, дазваляе прасачыць асаблівасці пераўтварэнняў не толькі з пункту гледжання грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных, культурных зменаў, але і надаць увагу ўнутраным зменам дзявочай ідэнтычнасці, карціны свету ўвогуле, што ва ўмовах постіндустрыяльнага індывідуалізаванага грамадства становіцца асноватворным чыннікам для вызначэння сябе прадстаўніком адпаведнай групы.

Акрамя гэтага, надзвычай актуальным застаецца пытанне захавання памяці аб традыцыйнай культуры рэгіёнаў Беларусі, паколькі асноўная маса яе фенаменаў не знаходзіць адлюстравання ў сённяшнім жыцці і функцыянуе на ўзроўні ўспамінаў прадстаўнікоў старэйшага пакалення.

Да гэтага часу праблема не была прадметам спецыяльнага даследавання. А разам з тым, комплексны аналіз працэсаў трансфармацыі паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат дазваляе глыбей зразумець сацыякультурныя асновы жыцця беларускага этнасу, вызначыць асноўныя тэндэнцыі яго развіцця ў сучаснасці і ў будучым.

**3. Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца першым у беларускай этналогіі сістэмным даследаваннем трансфармацыі паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст. з прымяненнем міждысцыплінарнага падыходу.

Упершыню ў беларускай этналогіі сістэмна разгледжаны канцэпт «дзявоцтва», дадзена вызначэнне паняццяў «дзявочая паўсядзённасць», «трансфармацыя дзявочай паўсядзённасці». Аўтарам была раскрыта сутнасць змен становішча сельскіх дзяўчат у сям'і, прааналізавана дынаміка іх грамадскіх статусных і ролевых пазіцый, вызначаны характэрныя рысы трансфармацыі культуры дашлюбных паводзін дзяўчат, выяўлены асаблівасці культуры жыццезабеспячэння і яе ўплыву на дзявочую паўсядзённасць.

Селях А.А. упершыню ў айчыннай этналогіі комплексна разлядае пытанні фарміравання рукапіснай культуры заходнепалескіх сельскіх дзяўчат і культуры дзявоцтва ўвогуле; надаецца асобная ўвага аналізу працоўных стратэгій дзяўчат як часткі культуры жыццезабеспячэння.

Аўтар уводзіць у навуковы зварот шырокі корпус крыніц, значная доля якіх была сабрана ў выніку ўласных шматгадовых палявых даследаванняў.

Навуковыя высновы, атрыманыя саіскальніцай, з'яўляюцца новымі і арыгінальнымі. Даследаванне А.А. Селях з'яўляецца поўнасцю самастойнай навуковай працай.

**4. Абгрунтаванасць і дакладнасць вынікаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Высновы, да якіх прыходзіць аўтар у сваім даследаванні, з'яўляюцца дакладнымі і цалкам абгрунтаванымі, што абумоўлена высокім навуковым узроўнем дысертацыі.

Дысертацыйнае даследаванне А.А. Селях выканана на падставе шырокага кола вусных, пісьмовых, візуальных і рэчавых крыніц, сярод якіх галоўнае месца займаюць матэрыялы ўласных палявых этнаграфічных даследаванняў аўтара. У рабоце выкарыстаны актуальныя ў сучасных этналагічных даследаваннях метадалагічныя падыходы: антрапалагічны, культуралагічны, гендарны, псіхааналітычны, сістэмна-функцыянальны. Яны дазволілі саіскальніцы правесці комплекснае даследаванне трансфармацыі паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст. і прыйсці да аргументаваных высноў.

Задачы, якія сфармулявала ў сваёй рабоце А.А. Селях, вырашаны ў поўным аб'ёме, што дае падставу сцвярджаць аб дасягненні пастаўленнай даследчыцай мэты. Вынікі, атрыманыя ў дысертацыі, адпавядаюць навуковым палажэнням, якія выносяцца на абарону.

У першай главе саіскальніцай на высокім навуковым узроўні прааналізавана гістарыяграфія праблемы, ахарактарызаваны крыніцы і метады даследавання. Вызначэнне асноўных перыядаў станаўлення і развіцця фамілістычных даследаванняў спрыяе сістэматызацыі апублікаваных прац па даследуемай праблеме. Падрабязная характарыстыка розных тыпаў крыніц і абгрунтаванне абраных метадаў абумоўлівае далейшую структуру даследавання і ўнутранае адзінства тэкста работы.

У другой главе на падставе шматлікіх крыніц аўтар аналізуе дынаміку трансфармацыі становішча дачкі ў сям'і, што мела праяву ў паступовым паслабленні яе падпарадкаванага становішча ў адносінах з бацькамі, звязаным з пашырэннем магчымасцей эканамічнага самазабеспячэння, магчымасцю павышэння адукацыйнага ўзроўню дзяўчат, дэтабуізацыяй інтымнай прасторы жыцця, пашырэннем масавай культуры, што адбывалася не надта імклівымі тэмпамі і мела найбольшую праяву ў 50–80-я гг. XX ст.

Трэцяя глава прысвечана аналізу становішча дзяўчыны ў сельскім соцыуме ў даследуемы перыяд. Аўтар прыходзіць да высновы, што, нягледзячы на працэс узрастання сацыяльнай мабільнасці дзяўчат, некаторае паслабленне пераемнасці традыцый паміж пакаленнямі, індывідуалізацыю жыцця і значныя змены ў формах баўлення вольнага часу, вясковы соцыум не страціў рэгламентуючай ролі як у пытаннях выхавання і сацыялізацыі дзяўчат, так і ў фарміраванні іх грамадскага статуса нават у 1970–1980-я гг.

У чацвёртай главе А.А. Селях разглядае асаблівасці культуры жыццезабеспячэння сельскіх дзяўчат. Дысертантка характарызуе асноўныя формы дзявочых працоўных практык, якія ажыццяўляліся па-за межамі вясковай лакальнай прасторы, што стварала спрыяльныя ўмовы для самастойнага забеспячэння асабістых базавых патрэб і паслабляла прынцып строгай падпарадкаванасці ўнутры сялянскай сям'і.

## 5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні

*Навуковая значнасць*

Дысертацыя А.А. Селях з'яўляецца значным укладам у вывучэнне сацыяльнай культуры беларускага этнасу. Абагульненні, тэарэтычныя палажэнні і вывады дысертацыі могуць быць выкарыстаны спецыялістамі для далейшага навуковага пошуку ў галіне этналогіі, сацыяльнай антрапалогіі, вуснай гісторыі.

*Практычная значнасць*

Вынікі і матэрыялы даследавання, метадалагічныя распрацоўкі А.А. Селях могуць быць запатрабаваныя пры правядзенні тыпалагічных даследаванняў, а таксама ў вучэбным працэсе ва ўстановах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь для спецыяльнасцей культуралагічнага, гістарычнага, мастацтвазнаўчага профілю. Сабраныя палявыя матэрыялы (фотаздымкі, помнікі дзявочай рукапіснасці) маюць вялікую каштоўнасць і могуць быць выкарыстаны ў дзейнасці краязнаўчых музеяў, палацаў культуры, клубных устаноў.

*Сацыяльная значнасць*

Высновы, зробленыя аўтарам у выніку навуковага аналізу спецыфікі трансфармацыі паўсядзённасці асобнай сацыяльнай групы заходнепалескага вясковага соцыума, набліжаюць да вырашэння шэрагу фундаментальных этналагічных і сацыякультурных праблем сучаснага грамадства, сярод якіх праблема функцыянавання механізма трансляцыі і ўзнаўлення нацыянальных культурных традыцый, праблема ментальнасці грамадства, праблема ўнутранай кансалідацыі сацыяльнай супольнасці.

## 6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковых выданнях

Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыі знайшлі дастаткова поўнае адлюстраванне ў 36 навуковых работах, з іх 8 – артыкулы, уключаныя ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, 9 – артыкулы ў зборніках навуковых работ, 17 – артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 2 – тэзісы выступленняў на навуковых канферэнцыях. Аб'ём артыкулаў у выданнях, уключаных ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, складае 5,8 аўтарскага аркуша. Агульны аб'ём публікацый – 12,5 аўтарскага аркуша.

Матэрыялы працы прайшлі шырокую апрабацыю на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях, сярод якіх Міжнародная канферэнцыя "Wspólne dziedzictwo kulturowe. Dialog kultury z naturą" (Беласток, 2015), Міжнародны форум "Першы крок у навуку – 2016" (Мінск, 2016), Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя маладых вучоных (Брэст, 2016), Міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава" (Гродна, 2019), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Этнакультурная спадчына Беларусі ў XXI стагоддзі" (Мінск, 2021), Міжнародная навуковая канферэнцыя "Традиции и современное состояние культуры и искусств" (Мінск, 2021), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Образование: Опыт. Инновации. Перспективы" (Мінск, 2022), Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы" (Гомель, 2021, 2023, 2025), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі "ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы" (Мінск, 2019, 2022, 2024), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Актуальные направления исследований современной антропологии" (Мінск, 2022), Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Историческая наука: достижения проблемы, перспективы" (Брэст, 2021, 2022, 2023), Рэспубліканская навуковая канферэнцыя маладых даследчыкаў "Культурная спадчына і гістарычная памяць" (Брэст, 2024, 2025); Форум Саюзнай дзяржавы "Роль молодежи в сохранении и защите исторической памяти" (Магілёў, 2025), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Западная Беларусь 1921–1939 гг. в пространстве и времени: к 100-летию Белорусской крестьянско-рабочей Громады и дню Народного единства" (Брэст, 2025);

Рэспубліканская навуковая канферэнцыя “Гісторыка-культурная спадчына Беларусі: вывучэнне, захаванне, папулярызацыя” (Брэст, 2025).

**7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Агульны аб’ём дысертацыі А.А. Селях – 178 старонак, з іх 122 старонкі займае асноўны тэкст. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, 4 глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадаткаў. Бібліяграфічны спіс утрымлівае 297 пазіцый. Дадаткі займаюць 25 старонак.

Дысертацыя мае лагічна абгрунтаваную структуру. Аўтарэферат у поўнай меры адлюстроўвае змест дысертацыі.

Дысертацыя і аўтарэферат афармлены ў адпаведнасці з Інструкцыяй па афармленні дысертацыі, аўтарэферата і публікацый дысертацыі, зацверджанай Пастановай Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 28 лютага 2014 г. № 3.

**8. Заўвагі па дысертацыі**

Адзначаючы несумненную вартасць даследавання, лічу патрэбным выказаць некаторыя заўвагі і рэкамендацыі па змесце дысертацыі. Улічваючы, што абарона дысертацыі адбываецца паўторна, і дысертантка выправіла тэкст адпаведна з заўвагамі, якія былі зроблены падчас першай абароны, я б хацела звярнуць увагу на тое, што:

1. Пры аналізе дасягненняў польскіх навукоўцаў у вывучэнні Заходняга Палесся ў 1930-я гады (с. 13 дысертацыі) Аксана Аляксандраўна, акрамя самых значных даследаванняў, якімі з’яўляюцца работы Юзафа Абрэмбскага, выдзяляе публікацыі Гансяроўскага, Асэндоўскага, Марчака, шэраг прац вучняў краязнаўчага гуртка дзяржаўнай гімназіі ў Пінску. Падаецца, што варта было б таксама звярнуць увагу на такія даследаванні, як “Czudzin. Wieś powiatu łuninieckiego. Stosunki społeczno-gospodarcze” (“Чудзін. Вёска Луніненцкага павета. Сацыяльна-гаспадарчыя адносіны”) Рудольфа Ралецкага, напісаную у якасці дыпломнай работы ў Галоўнай школе гандлёвай у Варшаве (абаронена ў 1934 годзе, захоўваецца ў архіве бібліятэкі гэтай установы), а таксама “Dezorganizacja wsi poleskiej Olmany” (“Распад сацыяльнай структуры палескай вёскі Альманы”) удзельніцы адной з экспедыцый Юзафа Абрэмбскага Ванды Ліпіньскай (Мрозэк), напісаную у якасці магістарскай работы ў Варшаўскім універсітэце (абаронена ў 1939 годзе, захоўваецца ў архіве Варшаўскага універсітэта).

2. Характарызуючы тэрміналогію для азначэння жаночай ўзроставастатуснай перыядызацыі, на с. 61 аўтар піша: “…вызначальным крытэрыем перыядызацыі фармальна з’яўляюцца фізіялагічныя змены. Пры гэтым варта

звярнуць увагу на тое, што пераход з “дзяўчыны” ў “дзеўку” па народных ацэнках адбываўся не толькі з нагоды фізіялагічнай сталасці”. Улічваючы, што далей ў тэксце намінацыі «дзяўчына» і «дзеўка» выкарыстоўваюцца ў якасці сінонімаў, то падаецца, што тут мае месца памылка друку, якая, аднак, зацямняе сэнс выказвання.

Дадзеныя заўвагі носяць характар пажаданняў і не ўплываюць на агульны высокі навуковы ўзровень дысертацыі А.А. Селях.

**9. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Дысертацыя, аўтарэферат і публікацыі А.А. Селях сведчаць аб высокім узроўні навуковай падрыхтоўкі саіскальніцы, якая добра валодае працэдурай і метадамі сістэмнага навуковага даследавання, уключаючы навыкі пастаноўкі навуковых задач, абгрунтаванага і аргументаванага іх вырашэння і прафесійнага прымянення метадаў этналагічнага даследавання. Прадстаўленая дысертацыя з’яўляецца самастойным арыгінальным даследаваннем, выкананым на падставе шырокага кола крыніц, у якім распрацавана важная як у тэарэтычных, так і ў практычных адносінах тэма, што адпавядае спецыяльнасці 07.00.07 − «этнаграфія, этналогія і антрапалогія». Высокі ўзровень праведзенага даследавання і атрыманыя вынікі сведчаць аб тым, што навуковая кваліфікацыя А.А. Селях адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

**10. Заключэнне**

Дысертацыя А.А. Селях «Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20 – 80-я гг. XX ст.» з’яўляецца самастойна выкананай навукова-кваліфікацыйнай работай. Яна цалкам адпавядае патрабаванням Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, што прад’яўляюцца да дысертацыйных прац на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук і адпавядае пунктам 19, 20 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь».

Лічу, што саіскальніца заслугоўвае прысуджэння ёй вучонай ступені кандыдата гістарычных навук за:

- выяўленне логікі і напрамкаў трансфармацыі пазіцыі сельскіх дзяўчат у сям’і, адлюстраванне працэсаў станаўлення суб’ектнасці палескай сельскай дзяўчыны на працягу 1920 – 1980-х гадоў;
- раскрыццё механізмаў рэгламентацыі грамадскага статуса сельскіх дзяўчат праз уздзеянне вясковага соцыума;

- вызначэнне асаблівасцей фарміравання і трансфармацыі дзявочай субкультуры: камунікатыўных практык, форм адлюстравання пачуццёва-эмацыйнага свету, спосабаў пазнання дзяўчынай сваёй інтымнай прасторы;
- аналіз працэсаў фарміравання новых умоў разгортвання дзявочай паўсядзённасці ў сувязі са зменай працоўных стратэгій сельскіх дзяўчат Заходняга Палесся ў 1950 – 1980-я гады;
- даследаванне асаблівасцей канструявання новага рэчавага свету палескай сельскай дзяўчыны ва ўмовах мадэрнізацыі.

Афіцыйны апанент,
кандыдат гістарычных навук,
старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных навук УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» І. С. Чарнякевіч

10.06.2026 г.

Черникевич И. С.
Подпись заверяю
Старший инспектор по кадрам отдела кадров учреждения образования «Гродненский государственный медицинский университет»
Е.А.Лесикова
«10» 06 2026 г.